# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № (37) САКАВІК 2017***

*Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці*



## ***КАПЯЖЫ***

***Капяжы,***
***Капяжы са стрэх.***
***Верабей —***
***Кіпцюркі сагрэў,***
***Ацяжэў набрынялы снег.***
***Ацяжэлі галіны дрэў.***

***Нібы першы вясновы гром,***
***Рэха кінуўшы між бароў,***
***Абудзіў раку крыгалом,***
***У гурты пазбіраў звяроў.***
***Пад птушыны нясмелы ўскрык***
***Ручаінка з гары паўзе.***





***Сакавік —***
***Вясны маладзік —***
***Праразаецца пакрысе.***
***Пачынаюцца і ў душы***
***Весняй радасці***
***Капяжы.***

***Анатоль Грачанікаў***

***Фота Ірыны Маркевіч***

# 2017 год – Год навукі ў Беларусі



*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб аб'яўленні 2017 года Годам навукі».*

Асноўнай мэтай дадзенага рашэння з'яўляецца павышэнне ролі навукі ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, стварэнне спрыяльных умоў для захавання і развіцця навуковага патэнцыялу, фарміраванне міжнароднага іміджу Беларусі як краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу.

Ураду даручана з удзелам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенню ў 2017 годзе Года навукі, які адлюстроўвае ўзаемадзеянне навукі з сацыяльнай сферай, галінамі эканомікі, інавацыйную дзейнасць, міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

Рэалізацыя плана мерапрыемстваў будзе спрыяць развіццю айчынных навуковых школ, вузаўскай і галіновай навукі для забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту краіны, прымнажэнню навуковага патэнцыялу Беларусі, падтрымцы творча думаючых маладых навукоўцаў і спецыялістаў, іх патрыятычнаму выхаванню.



# Беларуская навука

***Станаўленне беларускай навукі было пачата ў 20-я гг. XX ст.*** Хоць асобныя навуковыя пошукі вяліся на тэрыторыі Беларусі і да гэтага часу. Ва ўмовах ваеннай разрухі ўрадам рэспублікі быў прыняты шэраг мер па ліквідацыі непісьменнасці, адкрыцця ВНУ, а таксама стварэнню навуковых цэнтраў. Важным момантам у навуковым жыцця БССР стала адкрыццё ***Беларускага дзяржаўнага універсітэта***. Аднак для развіцця прадукцыйных сіл рэспублікі неабходна было стварэнне спецыялізаваных навуковых устаноў. Жыццё патрабавала значных функцыянальных распрацовак, накіраваных на пераадоленне тэхніка-эканамічнага адставання і вырашэння рэгіянальных праблем БССР. ***30 студзеня 1922 г. быў заснаваны Інстытут беларускай культуры***, старшынёй якога стаў ***С. Некрашэвіч.*** Навукова-даследчая праца ў Інбелкульце праводзілася па гуманітарным кірунку і прыродазнаўстве. ***У 1928 г. Інбелкульт стаў Акадэміяй навук БССР***, якая была ўрачыста адкрыт 1 студзеня 1929 г. Сярод акадэмікаў, яе заснавальнікаў, былі вядомыя навукоўцы і дзеячы культуры ***Я. Лёсік, і. Д. Жылуновіч, У. Ігнатоўскі, В. Ластоўскі, Я. Купала, Я. Колас*** і многія іншыя.

У 1924-1930 гг. былі створаны ***НДІ: санітарна-гігіенічны, сацыяльнай гігіены, туберкулёзу, гінекалогіі, працы, фізіятэрапіі, геалагічны, Цэнтральная тарфяная станцыя.*** Такім чынам, навука ад даследаванняў у невялікіх лабараторыях універсітэта і вышэйшых тэхнічных школ перайшла да сістэматычнай, добра арганізаванай працы ў навуковых інстытутах. ***Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі нашай рэспублікі дзейнічала 62 навуковыя ўстановы: 26 НДІ, 15 навуковых станцый, 2 запаведнікі, 3 музеі, 16 ВНУ.***

Гістарычна важным у падрыхтоўцы навукоўцаў і педагагічных кадраў у БССР стала ***“Палажэнне аб навуковых работніках вышэйшых навучальных устаноў і навуковых устаноў”*** ад 8 чэрвеня 1927 г., якое заклала прававыя асновы аспіранцкай формы навучання.

***Вялікія страты панесла беларуская навука падчас сталінскіх рэпрэсій.*** У 30-я гг. органы НКВД сфабрыкавалі справы «контррэвалюцыйных арганізацый». Неапраўдана абвінавацілі больш за 20 супрацоўнікаў АН БССР, у іх ліку былі В. Ластоўскі, Я. Лёсік, З. Жылуновіч і іншыя. Паводле дадзеных НКУС, на 1 ліпеня 1938 г. ў выніку «разгрому антысавецкага падполля ў БССР» колькасць асуджаных склала 2570 чалавек, у тым ліку акадэмікаў і супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР — 25, выкладчыкаў ВНУ - 41. ***Рэпрэсіі значна аслабілі кадравы патэнцыял вучоных рэспублікі.***



# У пасляваенны перыяд беларуская навука была адроджана ў літаральным сэнсе з попелу

***З пачатку 50-х гг. у БССР*** былі значна пашыраны даследаванні ў галіне ***фізіка-матэматычных і тэхнічных навук***. Развіваліся і новыя напрамкі ў галіне ***гуманітарных навук***. ***Да канца 80-х гг. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала больш за 160 дзяржаўных навуковых устаноў.*** Агульная колькасць людзей, занятых у сферы навукі і навуковага абслугоўвання Беларусі, склала больш за 100 тысяч чалавек.

Пра дынаміку росту асноўных фондаў навукі сведчыць ўвядзенне ў эксплуатацыю ***Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР, аддзела земляробства Міністэрства сельскай гаспадаркі, Інстытута анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя Беларусі*** і інш.

Дасягненні вучоных Беларусі па шматлікіх навуковых напрамках атрымалі прызнанне не толькі ў СССР, але і за яго межамі. У АН БССР скласіся навуковыя школы сусветнага ўзроўню па мовазнаўстве, тэарэтычнай фізіцы, фізічнай оптыцы і квантавай электроніцы, матэматыцы, хіміі, геалогіі і інш.

Распад СССР негатыўна адбіўся на становішчы навукі. Карэнныя змены ў дзяржаўным будаўніцтве — станаўленне незалежнай РБ — запатрабавалі рэфармавання і навуковай сферы. Скарачэнне фінансавання навукі, разбурэнне яе матэрыяльна-тэхнічнай базы, нізкая патрабавальнасць да вынікаў навуковых даследаванняў прыводзяць да скарачэння навуковага патэнцыялу рэспублікі і выезду многіх навукоўцаў за мяжу. Паводле звестак, прадстаўленых Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі (1999 г.), ***у 90-я гады з рэспублікі ў ЗША, Заходнюю Еўропу, Ізраіль эмігравала больш за 450 навукоўцаў.***

Галоўным навуковым цэнтрам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ***Нацыянальная Акадэмія навук.*** Яе роля ў арганізацыі, правядзенні і каардынацыі фундаментальных навуковых даследаванняў вызначаецца Законам РБ «АБ Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.




У наш час значэнне навукі ў жыцці грамадства паступова ўзрастае. Гісторыя чалавецтва сведчыць аб тым, што без выкарыстання дасягненняў навукі немагчыма паспяховае эканамічнае, сацыяльнае і тэхнічнае развіццё, павышэнне ўзроўню жыцця. Таму меры па падтрыманню навукі і стымулявання яе развіцця павінны стаць у XXI ст. неад'емным кампанентам дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

*Матэрыял падрыхтавала*
*Лізавета Вайцяховіч*

# Нататкі матацykліста

Працягваем нашы падарожжы па Беларусі. Мы купілі новы матацыкл Honda Deauville NT 650V … Дзякуючы гэтаму і пазнаёміліся з Аляксандрам Кобай – уладальнікам такога ж. Па прапанове Аляксандра, мы ўступілі ў групу дэвілаводаў. Потым неяк нечакана нам прапанавалі праехацца з імі ў бок Барысава, на Брылёўскае поле. У viber абмеркавалі, што паедзем 2-га красавіка. Але надвор'е 1-га красавіка было агідным любому падарожніку, не кажучы ўжо пра матацыклістаў, але мы ўсё роўна ўпарта збіраліся ў паездку. І вось 2-га красавіка ўжо чакаем, як мы думалі, невялікую групу, ну максімум з 5 чалавек, а аказалася…што ў прохваце прымае ўдзел 11 матацыклаў, адзін аўтамабіль тэхпадтрымкі і 17 чалавек удзельнікаў(восем Deauville, адзін Pan ST1100, адзін FJR1300, адзін Suzuki SV650S). Мы сустрэліся на газпрамаўскай запраўцы і абмеркавалі нашы далейшыя дзеянні.




Спачатку вырашылі паказаць ім нашу мясцовую славутасць - дом графа Патоцкага. Тут мы і пазнаёміліся бліжэй. Вырашылі, што доўга затрымлівацца не будзем, пакуль ехалі па Беразіно, людзі былі ў шоку, машыны сігналілі: столькі матацыклаў не кожны дзень убачыш. Заехалі да нас дадому за дровамі, бо мы збіраліся адпачыць на свежым паветры.



Далей накіраваліся ў бок Барысава. Мы з татам упершыню вялі калону. Даехалі да Барысава і вырашылі запраўіцца і – пафоткацца.



## Нататкі матацыкліста

Заехалі ў гандлёвы цэнтр, пасля машына тэхпадтрымкі па навігатару павяла нас да Брылёўскага поля. У некаторых на матацыклах былі ўстаноўлены калонкі для праслухоўвання музыкі, таму мы ехалі вельмі пацешна. Дабраўшыся да месца, мы агледзелі Брылёўскае поле – помнік у гонар герояў Айчыннай вайны 1812 года. Побач знаходзяцца 9 брацкіх магіл рускіх воінаў (1962). Комплекс складаецца з 5-ці элементаў, у тым ліку стэлы з двухгаловым арлом. Калі глядзець на манумент збоку, то арол адлюстроўваецца ў выглядзе сілуэта Напалеона ці афіцэра арміі 1812г., які нахіліў у маркоце галаву. Яшчэ ёсць званіца з вельмі гучным звонам, гук ад якога расплываецца па нізіне да самай ракі.



Тут таксама зрабілі сумеснае фота і адправіліся ўніз, да ракі, дзе вырашылі адпачыць і падсілкавацца. Да майго здзіўлення, месца аказалася цалкам абсталяваным для пляжнага адпачынку. Мы смяяліся, елі і зноў смяяліся, размаўлялі. Вечарам мы паехалі дадому, у Беразіно, а астатнія - на Мінск. Мы былі дома каля 19:30. Дзякуючы новаму матацыклу і новым знаёмствам, выйшла вось такое прыемнае, запамінальнае і пазнавальнае падарожжа.





*Марыя Власюк, фота аўтара*













# САКАВІЦКІ АБ’ЕКТЫЎ




## САКАВІК –

## *першы месяц вясны, трэці – года.*





У сакавіку пачынаецца рух сокаў у дрэвах, адсюль і назва – сакавік. Сакавік дрэвам сок пускае.

Як правіла, у сакавіку пачыналі адбывацца змены ў прыродзе? Перадусім – цяплела. Снег пачынае чарнець і раставаць. На высокіх месцах з’яўляюцца праталіны, бягуць ручайкі. Аднак часам мароз захоўваецца аж да канца месяца. Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.

На поўначы Беларусі клён дае сок у сярэдзіне сакавіка, бяроза — у канцы. З’яўляюцца "коцікі" на ранніх раслінах. З-пад сухой травы выглядаюць пралескі, зеляне трава. Прылятаюць гракі, за імі — шпакі, жаваранкі, канаплянкі, зяблікі. Такуюць глухары, потым цяцеры. Выводзяцца вавёркі, зайчыкі, ваўчаняты і іншыя зверкі. Пачынаецца нераст у рыб.

Народная мудрасць перасцерагае: не бярыся за плуг, пакуль баразна блішчыць (гэта значыць мокрая). Раней, абапіраючыся на багаты сялянскі вопыт, раілі пільнаваць капцы і ямы, у якіх схавана гародніна. Калі што-небудзь пачало псавацца, дык у цяплейшае надвор’ е неабходна перабраць. Каб садовыя дрэвы зацвілі пазней, варта накідаць каля ствала найболей снегу, утаптаць яго і прыкрыць гноем.

Па-ўкраінску сакавік называецца березень, а па-руску – март.

*Сакавік зялёны — ураджай благі.*
*Як у сакавіку туман, дык у жніво дождж — пан!*
*У сакавіку зіма не гніе — у красавіку трава не расце.*
*Няма ў сакавіку вады — няма ў красавіку травы.*
*Сакавік мокры — хлеб горкі.*

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына